дзе Таццяна хавае свайго каханага ў клеці, як у тым анекдоце з шафаю) і зніжаны паказ узаемаадносін паміж мужчынам і жанчынай. Прычым у творы адчуваюцца паралелі не толькі з "Рамэа і Джульетай", але і з "Яўгеніем Анегіным". Можна нават назваць паэму травестацыяй на пушкінскі варыянт. А імя галоўнай гераіні толькі падтрымлівае нашы здагадкі.

Такім чынам, можна сказаць, што ў беларускай літаратуры канца XIX стагоддзя формы мадыфікацыі смеху даволі разнастайныя. У творах Ф. Тапчэўскага апісваюцца розныя падзеі з жыцця мужыка, аўтар у сваіх вершах выкарыстоўвае такія прыёмы, як параўнанне, гукаперайманні, вульгарызмы і інш. А М. Марозік у сваёй паэме "Сцяпан і Таццяна" з гумарыстычнага боку паказвае ўзаемаадносіны мужчыны і жанчыны, выкарыстоўваючы пераважна прыём травестацыі.

***А. Д. Дакукін***
*Навук. кір.* ***А. М. Мельнікава****,*
*канд. філал. навук, дацэнт*

## ВОБРАЗЫ ПРЫРОДЫ Ў ТВОРЧАСЦІ АЛЕСЯ РАЗАНАВА

Прырода, клімат, пейзаж і падобнае ў першую чаргу ўплываюць на менталітэт народа. Найбольш яскрава ж культура і мова нацыі праяўляецца ў мастацкай літаратуры. Калі казаць пра А. Разанава, творы якога ўзятыя як матэрыял для выяўлення канцэптуальных адзінак, то можна ўбачыць, што ў пісьменніка за вобразамі, звязанымі з прыродным жыццём, замацоўваюцца як паняцці, характэрныя для беларускай ментальнасці ўвогуле, так і тыя, якія створаны самім пісьменнікам.

Сярод традыцыйных прыродных вобразаў у творчасці пісьменніка пераважаюць звязаныя з лесам і воднай прасторай. Канцэпт дрэва разумеецца пісьменнікам як мадэль Сусвету (увасабленне Неба, Зямлі і Падзем'я). Адначасна заўважаецца як безабароннасць чалавека перад веліччу дрэваў, так і ўспрыманне дрэў як "нашых братоў". Калі казаць пра спецыфіку адлюстравання канцэпту дрэва пісьменнікам, то часта дэндралагічныя аб'екты звязваюцца з канцэптам дома, а таксама ўвасабляюць усё вясковае, супрацьлеглае гарадскому. Найбольш частотным дрэвам у А. Разанава з'яўляецца бяроза, аднак ярка выражанай сувязі з народнымі ўяўленнямі аб гэтай расліне ў творах знойдзена не было; бяроза нярэдка адлюстроўваецца засохлай ці зжаўцелай.

Цікавыя асаблівасці назіраюцца і пры асэнсаванні вобраза вады ў творчасці А. Разанава. Так, у "Паэме калодзежа" распавядаецца аб сувязі жыцця, чалавека з вадой. Вада, неба і зямля ўяўляюцца пісьменнікам як звышнатуральныя з'явы, вельмі падобныя адна да адной. Вада ў творах паэта выступае як вадкасць ці цвёрдае рэчыва (снег, лёд). Знаходзіцца яна часцей за ўсё ў прыродных вадаёмах (рака, балота, крыніца), а таксама ў калодзежы, радзей – у хмарах, нябёсах.

Калі весці гаворку пра балота, то, канечне, варта назваць у першую чаргу паэму "Было балота". Дадзены водны аб'ект тут успрымаецца як небяспечнае месца (тое ж назіраем і ў народным светаўспрыняцці), бо там жывуць разнастайныя духі месцаў, міфічныя істоты. Аднак балота выступае адначасова і пачаткам усяго існага, у тым ліку і чалавека, месцам сакральным, якое захоўвае шмат таямніц.

Падсумоўваючы сказанае, можна адзначыць, што сукупнасць вобразаў А. Разанава, звязаных з прыродным жыццём, вельмі шматгранная. Пры гэтым цэнтральнымі выступаюць вобразы дрэва і вады. Выяўленне іх сутнасці пісьменнікам дазваляе казаць аб суіснаванні нацыянальных, агульнаментальных асаблівасцей з пэўнай аўтарскай індывідуалізацыяй дадзеных паняццяў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ